／# Весці БДПУ

Штоквартальны навукова-метадычны часопіс.
Выдаецца з чэрвеня 1994 г.

№ 3(53) 2007

СЕРЫЯ 2.
Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія.
Эканоміка. Культуралогія

**Галоўны рэдактар:**
П. Дз. Кухарчык

**Рэдакцыйная калегія:**
Н. Г. Алоўнікава
А. І. Андарала
(*нам. галоўнага рэдактара*)
У. В. Амелькін
В. А. Бондар
М. К. Буза
В. В. Бушчык
(*нам. галоўнага рэдактара*)
Ю. А. Быкадораў
(*нам. галоўнага рэдактара*)
І. В. Бялько
А. М. Вітчанка
С. Я. Гайдукевіч
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
В. М. Дабранскі
Л. М. Давыдзенка
А. В. Данільчанка
М. М. Забаўскі
В. Б. Кадацкі
Я. Л. Каламінскі
У. М. Калюноў
Л. В. Камлюк
Л. А. Кандыбовіч
І. В. Катляроў
П. В. Кікель
Г. А. Космач
У. М. Котаў
Н. І. Кунгурава
М. В. Лазаковіч
І. Я. Левяш
М. І. Лістапад
А. М. Люты
У. А. Мельнік
І. А. Новік
В. М. Русак
А. І. Смолік
В. Дз. Старычонак
В. Б. Таранчук
А. І. Таўгень
І. С. Ташлыкоў
В. М. Фамін
А. Т. Федарук
А. С. Цернавы
Л. Н. Ціханаў
І. І. Цыркун
М. Г. Ясавееў

## Змест

### Гісторыя

*Самусік А.Ф.* Становішча адукацыйнай справы на беларускіх землях у канцы XVIII – пачатку XIX ст. .......... 3

*Пілецкі В.А.* Вырашэнне актуальных праблем адукацыйна-выхаваўчага працэсу ў Беларусі (канец XIX – пачатак XX ст.) .......... 8

*Шаўчук І.І.* Студэнты-гуманітарыі БССР (1920–1930-я гг.): сацыяльна-дэмаграфічны агляд .......... 12

*Янкоўская Т.У.* Эвалюцыя маладзёжнага руху ў Беларусі (канец XX – пачатак XXI ст.) .......... 17

*Забаўскі М.М.* Расійскае самаўладдзе ў перыяд сацыяльных і палітычных узрушэнняў (1914–1917 гг.) .......... 20

*Пуцік У.С.* Указ аб верацярпімасці і актывізацыя грамадска-палітычнай дзейнасці рэлігійных канфесій ў Беларусі .......... 24

*Люты А.М., Лютая А.Э.* Статуты ВКЛ (1529, 1566, 1588 гг.) – крыніцы па гісторыі запрыгоньвання сялян у XVI ст. .......... 28

*Кадзіра У.М.* Беларуская і ўкраінская гістарыяграфія праблемы антыфеадальнай барацьбы ў другой палове XVI – першай трэці XVII ст. .......... 32

*Вялікая В.А.* Ажыццяўленне харчовай праграмы ЮНРРА ў Беларусі (1945–1947 гг.) .......... 35

*Салькоў А.П.* Балгара-югаслаўскія тэрытарыяльныя супярэчнасці ў савецкай палітыцы на Балканах (1941–1945 гг.) .......... 37

*Варывончык І.В.* Палітыка кіруючых адміністрацый і тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця ЗША (канец XX – пачатак XXI ст.) .......... 42

*Субоцін А.Г.* «Удар па Прусіі». Да гісторыі імперскай экзекуцыі 20 ліпеня 1932 г. у Германіі .......... 46

### Філасофія

*Новікаў В.М.* Гістарычны выбар Беларусі ў кантэксце сучасных ідэалагічных працэсаў .......... 51

*Крыштаповіч А.А.* Адкрытае грамадства: метадалогія сацыяльнай пабудовы .......... 56

### Паліталогія

*Зенчанка В.А.* Праблемы мадэрнізацыі палітычнай сістэмы грамадства: гістарычны вопыт і сучаснасць .......... 60

*Канапацкі М.Б.* Кемалізм і праблема развіцця свецкай дзяржавы .......... 63

*Лысюк А.І.* Імідж палітычнага лідэра ў працэсах культуралагічнай ідэнтыфікацыі .......... 66

*Казырэнка Н.П.* Асаблівасці палітычнай культуры пераходнага грамадства .......... 69

*Новікава С.І.* Развіццё ідэй і ўяўленняў аб праве і справядлівасці: ад антычнасці да праектаў сацыялістаў-утапістаў .......... 72

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

12. *Тихомиров, Л.А.* Христианство и политика / Л.А. Тихомиров – М., 1906. – 145 с.
13. *Забаўскі, М.М., Пуцік, У.С.* Прадстаўніцтва ад Беларусі ў Дзяржаўнай думе Расіі (1906–1917 гг.) / М.М. Забаўскі, У.С. Пуцік. – Мінск: БДПУ, 1998. – 158 с.
14. Правые партии. 1905–1917: док. и материалы: в 2 т. – М.: РОССПЭН, 1998. – Т. 1: 1905–1910 гг. – 720 с.



SUMMARY

*In the article the problems of the confessional politic of the monarchic government in Belarus in the beginning of the XX century are examined. Special attention is being paid to the change of the social and the political life of the region by the reason of the acceptance of the decree about the toleration on the 17 of April 1905.*


*УДК 947.6«16»*

***А.М. Люты, А.Э. Лютая***

# СТАТУТЫ ВКЛ (1529, 1566, 1588 гг.) – КРЫНІЦЫ ПА ГІСТОРЫІ ЗАПРЫГОНЬВАННЯ СЯЛЯН У XVI ст.

Статуты ВКЛ 1529, 1566 і 1588 гг. з'яўляюцца зводамі законаў феадальнага права. Яны падрыхтаваны на аснове кадыфікацыі і сістэматызацыі норм мясцовага звычаёвага права агульназемскіх і абласных прывілеяў, пастаноў судовых і дзяржаўных устаноў, Судзебніка 1468 г. і норм царкоўнага (рымска-каталіцкага і грэка-праваслаўнага) права. Гэтыя статуты – найбольш поўныя і аб'ектыўныя крыніцы па гісторыі працэсу запрыгоньвання сялян ВКЛ у XVI ст.

Першы Літоўскі Статут быў падрыхтаваны ў Вільнюсе і прыняты на Вільнюскім сойме «па dzien swietego Michala» 29 верасня 1529 г. [5, s. 179; 7]. Ён выгадна адрозніваўся ад многіх феадальных судзебнікаў Еўропы не толькі сваім значна большым аб'ёмам, але і зместам, які ахопліваў усе галіны права: угалоўнае, грамадзянскае, дзяржаўнае, працэсуальнае і інш. «В Статуте 1529 г. получили юридическое закрепление основы общественного и государственного строя, правовое положение классов, сословий и социальных групп населения, порядок образования, состав и полномочия некоторых органов государственного управления и суда» [15; 30, с. 47]. Статут 1529 г. складала камісія пад кіраўніцтвам канцлера ВКЛ, буйнейшага магната А. Гаштольда (па-літоўску А. Гоштаўтуса) – аднаго з самых адукаваных на той час чалавека, які аддаваў перавагу законам «пісаным » перад догматамі хрысціянскай веры. Ён лічыў, што хрысціянская вера без пісьмовых законаў мёртвая [10, с. 8; 13]. Ёсць меркаванні, што ў складанні, абмеркаванні і рэдагаванні Статута 1529 г. прымаў удзел і Ф. Скарына [27, с. 414; 28].

XVI ст. было пераломным у гісторыі феадалізму ў ВКЛ. Гэта быў перыяд канчатковай кансалідацыі класа феадалаў у цэлым як прывілеяванага саслоўя ўсёй дзяржавы і зацвярджэння неабмежаванага яго панавання над прыгнечаным сялянствам.

Асноўныя правы класа феадалаў былі зацверджаны ўжо земскім прывілеем 1447 г. Наступныя прывілеі вялікіх князёў Аляксандра і Сігізмунда Старога пацвердзілі і значна пашырылі іх [14; 26].

Першы Літоўскі Статут не толькі падвёў вынік працэсу запрыгоньвання, але і аформіў яго юрыдычна на новым, больш высокім узроўні заканадаўства ў маштабах усёй дзяржавы ў адпаведнасці са змяніўшыміся гістарычнымі ўмовамі і становішчам, якое заваяваў к гэтаму моманту клас феадалаў ва ўсіх сферах эканамічнага, палітычнага і грамадскага жыцця. Статут 1529 г. з гэтага пункту гледжання з'яўляецца найбольш тыповым свайго роду зводам феадальных законаў, устаноўленых у інтарэсах і па запатрабаваннях пануючага прывілеяванага класа. Напісаны Статут 1529 г. на старабеларускай мове, якая ў той час была дзяржаўнай і выкарыстоўвалася ўсімі ўстановамі ВКЛ (у тым ліку і вялікакняжацкай канцылярыяй) [10; 14; 19; 21].

Першы Літоўскі Статут складаўся з 13 раздзелаў і 244 артыкулаў, кожны з якіх з'яўляўся асобнай юрыдычнай нормай. Але Статут 1529 г. не быў надрукаваны [10, с. 12], таму ўсім установам і чыноўнікам неабходна было перапісаць для сябе хаця б па адным экзэмпляры. Так Першы Літоўскі Статут у вельмі кароткі час разышоўся ў мностве спісаў. Юрыдычны арыгінал не ўдалося знайсці. Даследчыкі лічаць, што ён загінуў яшчэ ў канцы XVI – пачатку XVII ст., а з цягам часу загінула ці было згублена і большасць спісаў. Захавалася і дайшло да нашага часу некалькі спісаў, пры гэтым іх тэксты не заўсёды адпавядаюць адзін аднаму.

Вядома чатыры спісы (Фірлейскі, Замойскіх [7, BOZ-77], Дзялынскіх і Слуцкі), напісаныя на старабеларускай мове, і тры перакладзеныя: Лаўрэнцьеўскі [17], Пулаўскі [10, с. 13] – на лацінскай мове і Альшэўскі – на польскай [7 – 8088], а таксама два спісы на польскай мове: Востра-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

бранскі (копія гэтага спіса – раздзелы IV–XIII, перапісаныя рукой І. Лелявеля, захоўваецца ў Курніцкай бібліятэцы Польскай акадэміі навук) і Свідзінскі (надрукаваны ў Пазнанскім выданні) загінулі ў бібліятэцы Красінскіх у Варшаве падчас пажару 1944 г. у перыяд гітлераўскай акупацыі [8, с. 13; 10].

Ва ўмовах пашырэння прыгонніцтва і феадальнага ўціску, беззаконня, якое ўчынялі землеўладальнікі ВКЛ, была зроблена спроба абмежаваць халопства, каб пазбегнуць абвастрэння сацыяльных канфліктаў. Вольны чалавек за здзейсненае злачынства не павінен быў аддавацца ў вечную няволю [19, раздз. 11, арт. 7]. Але ў Статуце 1529 г. даволі поўна выкладзены юрыдычныя нормы, якія забяспечвалі права ўласнасці феадалаў. Сяляне не мелі права ўласнасці на зямлю. Землеўладальнікамі маглі быць толькі шляхта, царква і дзяржава. Частка сялянства аказалася «прыкрэпленай» да зямлі. Статут устанаўліваў дзесяцігадовы тэрмін пошуку збеглых сялян [21, раздз. 1, арт. 1–19, раздз. 7, арт. 27, раздз. 10, арт. 1].

Старажытнай і найбольш грубай і жорсткай формай асабістай залежнасці з'яўлялася рабства. У такой залежнасці знаходзілася ў ВКЛ «чэлядзь нявольная». Іх няволя разам з адсутнасцю права на выхад была і ў тым, што феадалы мелі неабмежаваныя правы ўласнасці на яе. Асноўнай крыніцай папаўнення «чэлядзі нявольнай» з'яўляліся сяляне. Нявольнымі прызнаваліся і дзеці, народжаныя ў законным шлюбе нявольных са свабоднымі. Вельмі значнай крыніцай папаўнення складу «чэлядзі нявольнай» былі палонныя. Сярод палонных значную частку складалі «маскавіты», гэта значыць жыхары Рускай дзяржавы [4; 19, раздз. 11, арт. 13 (12)]. Статут ВКЛ 1529 г. называе чатыры крыніцы рабства: народжаныя ў сем'ях «чэлядзі нявольнай», палон, замена рабствам смяротнай казні за здзейсненае злачынства і шлюб з нявольнікам [21, раздз. 11, арт. 12, 13].

Не мелі права пераходу ад аднаго феадала да іншага і людзі «непахожыя», ці «вотчычы». Таму шляхта намагалася перавесці ў гэты стан і людзей «пахожых» (сялян, якія яшчэ мелі магчымасць служыць таму феадалу, якому хацелі, і пры агавораных умовах мелі права пераходу ад аднаго землеўладальніка да іншага). Для феадалаў, зацікаўленых у замацаванні сялян на зямлі і іх запрыгоньванні, было важна ўвядзенне адзіных норм выхаду і прыняцця «пахожых» людзей, бо іх розніца ў асобных маёнтках з'яўлялася адной з асноўных прычын пераходаў і ўцёкаў. Адзіныя нормы ўводзіліся ў асобных землях у выніку згоды ўсіх феадалаў таго ці іншага рэгіёну.

Для падрыхтоўкі Другога Статута ВКЛ у 1551 г. меркавалася стварыць камісію з 10 чалавек (5 католікаў і 5 праваслаўных) [14; 16; 22; 24], але яго праект рыхтавала іншая камісія: «особы певные, рады наши, маршалкове, врядники земские, хоружие и иные особы ряду и народу шляхецкого, доктори прав чужоземских, которые заседши не одно поправили тот статут старый, але теж новым кшталтом некоторые розделы звлаща судовый, за засаженым новым обычаем суду и порадку судового то становили и написали». Працай гэтай камісіі кіраваў канцлер ВКЛ М. Радзівіл Чорны, а членамі яе былі маршалак дворны А.Б. Валовіч, П. Раізій, А. Ратундус і інш. [27, с. 415].

У Статут 1566 г. былі ўпісаны Віленскі прывілей 1563 г., Бельскі прывілей 1564 г., Віленскі прывілей 1565 г. Статут складаўся з 14 раздзелаў і 367 артыкулаў. Ім карысталіся ў Беларусі і Літве да 1589 г., г. зн. да ўвядзення ў дзеянне Статута 1588 г., а на Правабярэжнай Украіне, якая ў 1569 г. была далучана да Польшчы, ён дзейнічаў больш за 260 гадоў. Па звестках В. Раўдзелюнаса, зараз вядома 58 рукапісных тэкстаў (спісаў) Статута 1566 г.: 13 на старабеларускай мове, 40 – на польскай і 5 на лацінскай мове. Беларускі тэкст Статута ўпершыню быў надрукаваны ў Маскве ў 1855 г. у невялікай колькасці экзэмпляраў [28, с. 9]. У 1900 г. у Кракаве ён быў апублікаваны на польскай і лацінскай мовах [2, 3, 22].

Неабходнасць стварэння Другога Літоўскага Статута была выклікана зменамі, што адбыліся ў сацыяльна-эканамічным і палітычным жыцці дзяржавы ў 40–50-х гг. XVI ст., асабліва пасля правядзення аграрнай рэформы 1557 г. Канчаткова Статут 1566 г. быў уведзены ў дзеянне пастановай Віленскага сойма 1 сакавіка 1566 г. Праўда, праца па яго ўдасканаленні працягвалася і пасля яго ўвядзення ў дзеянне. Так, 1 ліпеня 1566 г. на Берасцейскім сойме былі ўнесены змены ў артыкул 1 раздзела 7, які прадугледжваў поўную свабоду шляхце распараджацца сваімі маёнткамі. У адрозненне ад Статута 1529 г., які рэгламентаваў права феадалаў свабодна распараджацца трэцяй часткай нерухомасці [19; 8, раздз. 1, арт. 15], Статут 1566 г. замацаваў норму аб неабмежаваным распараджэнні землеўладаннямі [24, раздз. 7, арт. 1].

Феадальна-залежныя сяляне не толькі не мелі права ўласнасці, але і права без дазволу пана прадаваць зямлю, якой ён карыстаўся [22; 24, раздз. 9, арт. 18], а таксама змяняць месца жыхарства [22, раздз. 12, арт. 8–9]. Самай беспраўнай часткай насельніцтва, як і па Статуце 1529 г., былі «чэлядзь нявольная» і палонныя, якія знаходзіліся ў становішчы рабоў. Яны не лі-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

чыліся суб'ектамі права, не маглі нават завяшчаць і атрымліваць маёмасць па завяшчанні [22, раздз. 8, арт. 1, 4]. Да простых людзей шырока прымяняліся цялесныя пакаранні: калецтва і біццё дубцамі і пугамі. Калецтва магло быць у выглядзе адразання вушэй, носа, вуснаў і рук [24, с. 29].

Трэці Статут ВКЛ 1588 г. дзейнічаў з 1589, а пасля далучэння беларускіх, літоўскіх і ўкраінскіх зямель да Расійскай імперыі ў канцы XVIII ст. – у Віцебскай і Магілёўскай губернях да 1831 г., у Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях да 1840 г. [10; 28].

Статут быў падрыхтаваны высокакваліфікаванымі прававедамі пад кіраўніцтвам канцлера ВКЛ А.Б. Валовіча і падканцлера Л.І. Сапегі і зацверджаны прывілеем вялікага князя Жыгімонта Ш 28 студзеня 1588 г.[12; 18]. Нават праз дзвесце гадоў Статут ВКЛ 1588 г. лічыўся самым дасканалым зводам законаў у Еўропе. Кароль Рэчы Паспалітай Станіслаў Аўгуст, выступаючы на сойме ў 1776 г., гаварыў, што ў Вялікім княстве Літоўскім людзі шчаслівыя і з выгадай карыстаюцца Статутам 1588 г., а таму ён жадае, каб і ў Кароне (Польшчы) зрабілі сабе падобны Статут і дайшлі да такога шчасця, якім ганарацца ў Вялікім княстве Літоўскім [1; 3, s. 67; 11].

Статут канчаткова замацоўваў феадальны грамадскі лад і наяўнасць двух класаў: феадалаў і феадальна-залежных сялян. Статут асабліва вылучаў князёў, паноў рады і паноў харунжых, якія мелі права судзіць не толькі простых людзей, але і залежную ад іх шляхту, даваць ім у часовае карыстанне землі, маёнткі, а таксама адбіраць гэтыя маёнткі, нягледзячы на даўнасць уладання імі [23, раздз. 3, арт. 30; 25].

Прамежкавым слоем паміж феадаламі і сялянамі была маламаёмная і беззямельная шляхта, якая па маёмасным становішчы была блізкай да сялянства, але карысталася роўнымі з буйнымі феадаламі асабістымі правамі і прывілеямі. Працэс станаўлення і прававога адасаблення феадалаў і ваенна-служылых людзей у прывілеяванае саслоўе шляхты адбываўся на працягу некалькіх стагоддзяў, але канчаткова быў замацаваны Статутам 1588 г.

Становішча ўсіх катэгорый сялян вызначалася іх палітычным бяспраўем, абмежаванасцю грамадзянскай праваздольнасці. Феадальна-залежны чалавек канчаткова не мог без дазволу свайго гаспадара змяніць месца жыхарства ці перайсці да іншага феадала. «Гды бы который чоловек отчызный, будь боярин панцерный, путный або тяглый чаловек, отчыч прирожоный або купленный, выслужоный и яко колвек набытый, отшодшы от пана своего, … челедь дворная отчызная або полоненая, которая бы от панов своих утекла, против тое паном их ани далекость местца, ани давность помененая к отисканью правом слушным вадити и перекажати не маеть против самых и детей их» [23, раздз. 12, арт. 12].

Сацыяльны статус сялянства быў вельмі нізкі. Так, паводле Статута 1588 г. штраф за забойства (галоўшчына) шляхціца ў 10 разоў перавышаў галоўшчыну за «цяглага мужыка» [20, раздз. 2, арт. 27, раздз.12, арт. 3].

У Беларусі ў XVI ст. згадваюцца чатыры асноўныя катэгорыі эксплуатуемага насельніцтва, якія адрозніваліся па ступені залежнасці ад феадалаў: «людзі пахожыя», або «вольныя»; «людзі непахожыя», або «атчызныя» («отчычы»); «чэлядзь нявольная» (рабы) і «закупы». Аднак розныя формы асабістай залежнасці абазначаліся толькі двума тэрмінамі: «воля» і «няволя». Як сведчаць даныя адпаведных судовых спраў, тэрмінам «воля» абазначалася наяўнасць у селяніна права на пераходы і вызначаўся юрыдычны статус «пахожых» людзей. Тэрмін жа «няволя» сведчыў аб адсутнасці такога права і вызначаў юрыдычны статус як «нявольнай чэлядзі», так і «непахожых» людзей. «Закупы» знаходзіліся ў часовай няволі [6; 14, с. 155].

Старажытны інстытут закупніцтва (заклад асобы ў часовую няволю да адработкі або выплаты доўгу) захаваўся ў Беларусі да канца XVI ст. Калі памер адработкаў ў дагаворы не ўстанаўліваўся, то ён часцей за ўсё вызначаўся па артыкулах статутаў. Згодна з імі, нормы пагашэння доўгу за год працы складалі: 1529 г. – 15 грошаў мужчыне і 10 грошаў жанчыне, 1566 г. – адпаведна 50 і 30, 1588 г. – 100 і 60 грошаў [19; 21, раздз. 7, арт. 27, раздз. 11, арт. (9) 8, (10) 9, раздз. 12, арт. 7, 8; 22; 24, раздз. 3, арт. 29, раздз. 9, арт. 19, раздз. 12, арт. 8, 9, 10, раздз. 13, арт. 5, раздз. 14, арт. 29; 20; 23, раздз. 3, арт. 35, 38, раздз. 9, арт. 29, раздз. 12, арт. 12–18].

Артыкулы Статута 1588 г. заканадаўча аформілі прынцып дзесяцігадовай даўнасці, па якім устанаўлівалася, што вольны («пахожы») чалавек, які пражыў у пана дзесяць год, мог пакінуць яго толькі пры ўмове выплаты выкупу за сябе і кожнага са сваіх дзяцей па 10 коп грошаў і вяртання доўгу – «запамажання», г. зн. дапамогі інвентаром, зернем, жывёлай, грашамі. Выканаць такія цяжкія патрабаванні селяніну было амаль немагчыма, таму ён канчаткова рабіўся прыгонным. Да таго ж феадалы звычайна ігнаравалі дэклараванае Статутам 1588 г. права «засядзелых» сялян на выкуп сваёй волі. У Статуце запісана, што «... невольницы мають быти трояких причинъ: первые которые суть здавна въ неволи, або зъ невольныхъ се родятъ; другіе которые полоном заведены суть изъ земли непріятельское; третіе коли бы се сами въ неволю

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

подзали, а хто бы, ведаючы жонку невольную, въ малженство понялъ, хотя веловък вольный, тогды таковый самъ и дъти ихъ въ неволи бытии мають» [20; 23, раздз. 12, арт. 13].

У выніку прыгонніцкай палітыкі феадалаў і дзяржавы, асноўная маса сялян ВКЛ у канцы XVI ст. была «нявольнай». Аб завяршэнні гэтага працэсу сведчаць даныя шматлікіх інвентароў маёнткаў шляхты апошняй чвэрці стагоддзя, паводле якіх абсалютная большасць сялян лічылася прыгоннымі.

Такім чынам, да канца XVI ст. у ВКЛ у выніку працэсаў зближэння сацыяльна-эканамічнага статусу «нявольнай чэлядзі» са статусам прыгоннага сялянства і запрыгоньванне сялянства іншых катэгорый («людзі непахожыя», «отчычы», ці «катчызныя», «закупы») у асноўным сфарміраваўся адносна адзіны клас – саслоўе феадальнага грамадства – эксплуатуемае і прыгоннае сялянства, што заканадаўча было канчаткова замацавана Статутам 1588 г. [29].

Узмацненне ўсіх форм феадальнага прыгнёту, якое суправаджалася пагаршэннем сацыяльна-эканамічнага становішча сялянства, з'яўлялася галоўнай прычынай далейшага абвастрэння сацыяльных супярэчнасцей феадальнага грамадства ВКЛ.

*Літаратура і крыніцы*


1. *Бардах, Ю.* К вопросу об утверждении Литовского статута 1588 г. / Ю. Бардах // Славяне в эпоху феодализма. – М., 1978.
2. *Бардах, Ю.* Литовские статуты – памятники права периода Возрождения / Ю. Бардах // Культурные связи народов Восточной Европы в XVI в. – М., 1976.
3. *Bardach, I.* Statuty litewskie a prawo rzymskie / I. Bardach. – Warszawa, 1999.
4. *Барысёнак, С.* Нацыянальны характар Літоўскага Статута 1529 г. / С. Барысёнак // Полымя. – 1927. – № 6–7.
5. *Bernstein, M.* Poprawa I Statutu litewskiego 1531–1538 rr. / M. Bernstein // Czasopismo prawnicze I ekonomiczne. Rocznik XV, 1914. – Krakow, 1915.
6. *Бершадский, С.А.* Литовский статут и польские конституции: Историко-юридическое исследование / С.А. Бершадский. – СПб., 1893.
7. Biblioteka Naradowa. Rkp 8088, 1. 167.
8. *Крапивин, П.Ф., Чернецкая, Ю.И.* О рукописях и изданиях первого Литовского Статута / П.Ф. Крапивин, Ю.И. Чернецкая // Славянский архив. – М., 1959.
9. *Лабынцев, Ю.А.* «Статут Великого княжества Литовского» 1588 г. – памятник белорусской старопечатной литературы: (К 400-летию выхода в свет)/ Ю.А Лабынцев // Советское славяноведение. – 1988. – № 5.
10. *Лазутка, С., Гудавичюс, Э.* Первый Литовский Статут. [Т.] 1, ч. 1–2/ С. Лазутка, Э. Гудавичюс.– Вильнюс, 1983–1985.
11. *Лаппо, И.И.* Литовский Статут 1588 г. Т.1–2 / И.И. Лаппо. – Каунас, 1934–1938.
12. *Мякишев, В.* Возвращаясь к проблеме изданий Литовского Статута 1588/ В. Мякишев // Slavia Orientalis. – 1977. – № 2.
13. Первый Литовский Статут 1529 г.: материалы Респ. науч. конф.– Вильнюс, 1982.
14. *Пичета, В.И.* Земельное право в статутах 1529 и 1566 г. / В.И. Пичета // Пичета В.И. Белоруссия и Литва. XV–XVI вв. – М., 1961.
15. *Пичета, В.И.* Литовский Статут 1529 г. и его источники /В.И Пичета // Пичета В.И. Белоруссия и Литва. XV–XVI вв. – М., 1961.
16. *Подозерская, Г.Ф.* Второй Литовский Статут: (К истории его составления) / Г.Ф. Подозерская // Ист. записки. – 1945. – № 17.
17. *Пташницкий, С.Л.* К вопросу об изданиях и комментариях Литовского статута: Историко-библиографическая справка / С.Л. Пташницкий.– СПб., 1893.
18. *Пташницкий, С.Л.* К истории литовского права после третьего статута / С.Л. Пташницкий.– СПб., 1893.
19. Старый Литовский Статут 1529 // Временник Московского об-ва истории и древностей российских. – М., 1854. – Кн. 18.
20. Статут Великого княжества Литовского 1588 г. [печатанный с мамоничевского издания] // Временник Московского об-ва истории и древностей российских. – М., 18. – Кн. 19.
21. Статут Великого княжества Литовского 1529 г. – Минск, 1960.
22. Статут Великого княжества Литовского 1566 г. [и поправы статутовые 1578 г.] // Временник Московского об-ва истории и древностей российских.– М., 1855. – Кн. 23.
23. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588. Тэксты. Даведнік. Каментарыі. – Мінск, 1989.
24. Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 года. – Мінск, 2003.
25. Третий литовский Статут 1588 г.: материалы Респ. науч. конф. – Вильнюс, 1989.
26. *Улашчык, М.* Першы Літоўскі Статут: (З гісторыі знаходак і іх вывучэння) / М. Улашчык // Беларускі гіст. агляд. – 1966. – Сш. 1.
27. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 6. – Мінск, 2001.
28. *Юхо, Я.* Крыніцы беларуска-літоўскага права / Я. Юхо. – Мінск, 1991.
29. *Юхо, Я.* Статуты Вялікага княства Літоўскага / Я. Юхо // Полымя.– 1966. – № 11.
30. *Юхо, И.А.* Основные черты судоустройства и судопроизводства по Статуту Великого княжества Литовского 1529 года / И.А Юхо // Первый Литовский Статут 1529 г.: материалы Респ. науч. конф. – Вильнюс, 1982.



Summary

*The article analyses Codes of laws of Great principality of Lithuania – the statutes of 1529, 1566 and 1588, which show the completion of the process of enslaving peasants in Belarus. This is confirmed by the data reflecting stock – taking of estates of the nobility. A great number of trials testify the unfranchised status of serf peasants.*


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ